РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

**ЛО́ЗНІКІ**, нячысцікі, якія ўяўляліся на Віцебшчыне драбнюткімі гуллівымі чарцянятамі, што жывуць у густых кустах пераплеценага лазняку, адпаведна якому расфарбавана іх цела. Як і некаторыя інш. нячысцікі (*злыдні, касны, паветрыкі, паралікі, паўночнікі, шэшкі*), Л. дзейнічаюць толькі ў вялікім гурце. Яны не столькі ад злосці, колькі забаўляючыся, заблытваюць у куст лазы, у яе карэнні сваю ахвяру, ці прымушаюць яе праваліцца ў прыхаванае вадзяное акенца ў багне. Нацешыўшыся, яны самі дапамагаюць ахвяры выбрацца, падсоўваючы куст лазы, трыснёг, аер. Калі бедалагу не ўдалося выратаваць — гэта значыць, што яе падхапіў нейкі больш буйны нячысцік — *Вадзянік*, *Балотнік*, *Багнік*. Бясшкодныя маленькія Л. могуць быць выпадкова забітыя грамавымі стрэламі. Але галоўную небяспеку для Л. (як і для Балотніка) уяўляе асушэнне месца пад іх жытлом і з-за гэтага — знішчэнне лазняку, дзе праходзіць усё іхняе жыццё. У такім выпадку яны гінуць

усе разам назаўсёды і бясследна. Міфічным насельнікам лазы ўяўляўся таксама *Лазавік*.

*Літ.*: Никифоровский Н.Я. Нечистики, свод простонародных в Витебской Белоруссии сказаний о нечистой силе. Витебск, 1995.

*У. А. Васілевіч.*

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ